ПАДРАБЯЗНАСЦІ НОВАЙ УСТУПНАЙ КАМПАНІІ 4

КАНФЕСІЙНЫ КАЛЯНДАР НА 2023 ГОД 8-9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

5 СТУДЗЕНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 2 (29882)

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:

«Усе нашы планы на год вядомыя: нам трэба забяспечыць прыстойны рост. Ключавое пытанне — інвестыцыі. Неабходна больш як 20 працэнтаў укласці ў эканоміку краіны. Гэта ўсё павінна даць штуршок, у тым ліку стварэнню новых рабочых месцаў, асабліва ў рэгіёнах. Памятайце знакамітае наша «Адзін раён — адзін праект», яно цяпер якраз стартуе. Калі мы скончылі 2022 год з сярэдняй заработнай платай па бюджэтнай сферы ў Br1250, то планка, якую мы павінны ўзяць у бягучым годзе, — гэта Br1454. Усё для гэтага спланавана, за зарплаты турбавацца дакладна не трэба. У цэлым эканоміка краіны захавае сацыяльную накіраванасць. Пры ўсіх умовах беларусы могуць быць спакойныя, рэсурсаў дастаткова для таго, каб выканаць усе сацыяльныя абавязацельствы і не толькі іх».

Пакаштуйце сядзібу на смак

©фота БелТА.

Дзясяткі дзівосных экспанатаў вырабілі ў каледжах прафесійна-тэхнічнага профілю Гомельскага рэгіёна. Усе работы аб'яднаны адзінай тэмай «Мая любімая Гомельшчына». У прыватнасці, майстры Гомельскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа бытавога абслугоўвання стварылі некалькі макетаў сядзібы Горватаў, якая размешчана ў Нараўлянскім раёне. Макеты старажытнай пабудовы выкананы з хлебабулачных прадуктаў (пячэнне, пернікі, вафлі і іншыя). Вага вырабаў дасягае 10 кілаграмаў. Гэтыя кампазіцыі сталі ўпрыгожаннем абласной выставы, якая адбылася ў рамках губернатарскай ёлкі ў цырку Гомеля.

На здымку: майстар вытворчага навучання Наталля ШАПАВАЛАВА са сваім варыянтам салодкай сядзібы.

Эксклюзіў «Звязды»

Ірына КАСЦЕВІЧ:

«ЗАХАВАЦЬ І ПРЫМНОЖЫЦЬ» – ДЭВІЗ СІСТЭМЫ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ

Тры пераразлікі працоўных пенсій у 2022-м, новая сістэма добраахвотнага страхавання назапашвальнай пенсіі з падтрымкай дзяржавы, якую ў народзе ўжо назвалі «другой пенсіяй», рост памераў дапамог пры нараджэнні і выхаванні дзіцяці — з такімі вынікамі заканчвае год сістэма сацыяльнай абароны. Але ці ўдасца іх захаваць у наступным годзе? Ці чакаць павышэння пенсій і дапамог? Як працуе механізм добраахвотнага страхавання назапашвальнай пенсіі і колькі ахвотных ужо аформілі дагаворы? Колькі часу трэба плаціць узносы, каб атрымаць «другую пенсію»? Як у найбліжэйшай будучыні будзе мяняцца сістэма сацыяльнага абслугоўвання і як набор «сацыяльных паказанняў» заменіць медыцынскую мадэль? Як за апошняе дзесяцігоддзе змянілі сваё аблічча дамы-інтэрнаты? Пра гэта і іншае ў эксклюзіўным інтэрв'ю «Звяздзе» да Дня сацыяльнага работніка, які адзначаецца сёння, расказала міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ.

СТАР. 2-3

У адказ на санкцыі

Свае машыны хуткай дапамогі

У Брэсце распачата рэалізацыя беларуска-расійскага праекта па зборцы спецтранспарту

На заводзе «Брэстмаш» у Брэсце зараз збіраюць аўтамабілі хуткай дапамогі, машыны для транспарціроўкі людзей з абмежаванымі магчымасцямі, аўто для патрульна-паставой і кіналагічных службаў. Напярэдадні новага года адбылася прэзентацыя сумеснага праекта і падпісанне пагаднення аб пачатку работы па зборцы аўтамабіляў.

Работа над сумесным праектам прадпрыемстваў ТАА «Швабе Спецаўто» і ААТ «Брэстмаш» пачалася ў 2021 годзе. І ўжо ў ліпені мінулага года прадставілі першыя аўтамабілі кампаніі «Швабе Спецаўто» на базе беларускай мадэлі МАЗ-365022. Яшчэ на першых прэзентацыях адзначалася, што аўтамабілі, зробленыя на базе шасі МАЗа, выглядаюць цалкам дастойна. Машыны хуткай дапамогі абсталяваны цялежкамі-каталкамі, насілкамі, аптэчкамі, іншым медыцынскім абсталяваннем. Адпаведнае начынне атрымалі машыны іншага прызначэння.

СТАР. 5

КАРОТКА

- «Белтэхагляд» у 2022 годзе выдаў больш за 1,3 млн дазволаў на ўдзел у дарожным руху.
- **«Белпошта» датэрмінова выплаціць пенсіі за 7 студзеня.**
- Інавацыйныя пажарныя машыны беларускай вытворчасці паступілі ў падраздзяленні МНС.
- **Кіраўнікі дзяржорганаў правядуць у студзені асабістыя прыёмы грамадзян.**
- Экспарт будпаслуг летась дасягнуў $440 млн. Гэта рэкордны паказчык з 2016 года.

ISSN 1990 — 763X

9 771990 763008 23002

«ЗАХАВАЦЬ І ПРЫМНОЖЫЦЬ» – САЦЫЯЛЬНАЙ

Рост пенсій і дапамог, новы механізм назапашвальнай пенсіі

— Ірына Анатольеўна, з якімі вынікамі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны скончыла 2022 год?

— «Захаваць і прымножыць» — дэвіз, які суправаджаў сістэму сацыяльнай абароны ў 2022 годзе. Ці атрымалася захаваць сацыяльныя гарантыі для нашага насельніцтва? Безумоўна. Прымножыць — таксама.

Так, пазітыўнымі навінамі для пенсіянераў сталі тры пераразлікі працоўных пенсій, праведзеных у сакавіку, жніўні і снежні.

Важная навацыя для ўсіх беларусаў працаздольнага ўзросту — з 1 кастрычніка 2022 года запрацавала новая сістэма добраахвотнага страхавання назапашвальнай пенсіі з падтрымкай дзяржавы, — праграма «тры плюс тры», якая дазваляе павялічыць свой даход у старасці.

Што да сем'яў з дзецьмі, то для іх забяспечаны рост памераў дапамог пры нараджэнні і выхаванні. У параўнанні з 2021 годам сярэднямесячны памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў павялічыўся крыху больш чым на 13 % і ў снежні склаў 595,8 рубля. Сярэднямесячны памер дапамог, якія вылічваецца з бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, павялічыўся на амаль на 15 %.

Установлены адзіны памер штогадовай матэрыяльнай дапамогі шматдзетным сем'ям на падрыхтоўку дзяцей да навучальнага года, што дало магчымасць павысіць гэту выплату ва ўсіх рэгіёнах да ўзроўню Мінска. Сёлета матэрыяльную дапамогу атрымалі 114 тысяч шматдзетных сем'яў на 233 тысячы дзяцей-школьнікаў. З мясцовых бюджэтаў на гэтыя мэты накіравана амаль 23 мільёны рублёў.

Развіваецца і праграма сямейнага капіталу. З 1 студзеня 2022 года пашыраны магчымасці датэрміновага выкарыстання сямейнага капіталу па дзейных напрамках (жыллё, медыцына, адукацыя) і ўведзены новы напрамак — набыццё тавараў для членаў сям'і з інваліднасцю.

У 2022 годзе мы правялі пяты рэспубліканскі конкурс «Сям'я года», які стаў ужо своеасаблівым «сямейным рухам» у нашай краіне. У адборачных этапах конкурсу ўзялі ўдзел больш за паўтысячы сем'яў з усіх рэгіёнаў краіны. Пераможцам стала сям'я з Брэстчыны, якая выхоўвае пяцярых дзяцей.

Беларусы ўпершыню адзначылі новае агульнадзяржаўнае свята — Дзень бацькі (21 кастрычніка), які заснаваны па ініцыятыве кіраўніка дзяржавы. Яно атрымала афіцыйны статус нароўні з іншымі сямейнымі святамі — Днём маці (14 кастрычніка) і Днём сям'і (15 мая) — і пацвердзіла значнасць ролі бацькі ў выхаванні дзяцей, дабрабыце сям'і.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адным з ключавых момантаў на шляху стварэння інклюзіўнага грамадства стала прыняцце Закона «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі». Шэраг экспертаў ужо называюць яго інавацыйным. У ім улічаны і палажэнні абноўленай Канстытуцыі, і Канвенцыі аб правах інвалідаў, і ў цэлым запыты і патрэбы інвалідаў — іншымі словамі, комплексны падыход.

Другая пенсія, або 660 рублёў штомесяц на працягу пяці гадоў

— Вы згадалі сістэму добраахвотнага страхавання назапашвальнай пенсіі. Раскажыце, як на практыцы працуе гэты механізм? Якія плюсы бачаць для сябе ў ім удзельнікі? Ці будзе дапрацоўвацца і мяняцца гэта сістэма з часам?

— Добраахвотныя назапашвальныя пенсіі — не новы інстытут для Беларусі. Такія пенсійныя праграмы сёння прапануюць тры страхавыя арганізацыі. Аднак у адрозненне ад дзейных праграм з'явіўся новы фінансавы стымул — дзяржаўнае суфінансаванне. Яно заключаецца ў тым, што частка ўзносаў на назапашвальную пенсію будзе аплачана з дзяржаўных сродкаў. Гэта значыць, дзяржава матэрыяльна падтрымае работнікаў, якія прынялі рашэнне самастойна паўплываць на свой даход у пенсійным узросце.

Новая праграма заснавана на адпрацаваных на практыцы падыходах да фарміравання дадатковай назапашвальнай пенсіі. Так, работнік, заключыўшы дагавор са страхавой арганізацыяй «Стравіта», штомесяц выплачвае са свайго заробку дадатковы ўзнос да 10 %. Гэты ўзнос з дадатковым узносам ад дзяржавы (да 3 %) работадавец пералічвае ў «Стравіту» для інвеставання сродкаў на фінансавым рынку. Назапашвальная пенсія выплачваецца «Стравітай» па дасягненні работнікам агульнага пенсіённага ўзросту на працягу 5 або 10 гадоў — як вызначыць работнік.

Давайце разбяромся, як працуе дадзеная праграма на канкрэтным прыкладзе. Па разліках «Стравіты» ў работніка з заробкам на ўзроўні сярэдняга па краіне — каля 1500 рублёў, які б выплачваў узносы 15 гадоў па тарыфе 6 % (3+3) і абраў бы атрыманне пенсіі на працягу 5 гадоў пасля дасягнення агульнага пенсіённага ўзросту, памер дадатковай пенсіі склаў бы каля 660 рублёў (у выпадку перыяду атрымання пенсіі 10 гадоў — 330 рублёў). Гэта фактычна памер сярэдняй пенсіі па ўзросце для непрацоўнага пенсіянера (у снежні 670 рублёў). Гэта значыць, назва дадатковай назапашвальнай пенсіі ва ўжытку — «другая пенсія» — сябе апраўдвае.

Пры гэтым сярод галоўных фінансавых стымулаў новай праграмы — магчымасць атрымання ў спадчыну пенсіённых зберажэнняў і гарантыя іх захаванасці, падатковыя льготы.

За тры месяцы са «Стравітай» дагаворы ўжо заключылі больш за сем тысяч работнікаў. У асноўным гэта жанчыны, іх больш за 65 %. Не павінны заставацца ўбаку і мужчыны, чакаем ад іх больш актыўнага водгуку. Самы папулярны тарыф — «3+3», яго абралі больш за 70 % удзельнікаў.

Мы ўважліва адсочваем практыку прымянення новай праграмы, каб пры неабходнасці аператыўна карэкціраваць пытанні, якія ўзнікаюць.

«Нават у няпростых эканамічных умовах галоўная каштоўнасць дзяржавы — чалавек»

— Нам прадказвалі цяжкі 2022 год, у тым ліку з-за санкцыйнага ціску на эканоміку. Аднак у мінулым годзе пенсіі павышаліся некалькі разоў, напрыклад працоўныя — тройчы. Ці могуць і сёлета пенсіянеры разлічваць на такую ж падтрымку дзяржавы?

— Нават ва ўмовах няпростай эканамічнай сітуацыі галоўнай каштоўнасцю для беларускай дзяржавы застаецца чалавек. Выконваюцца ўсе сацыяльныя абавязацельствы, у тым ліку па падтрымцы пенсіянераў. У 2022 годзе праведзена тры пераразлікі працоўных пенсій. Акрамя сакавіка і жніўня з 1 снежня працоўныя пенсіі падраслі на 5 працэнтаў. Сярэдняя пенсія па ўзросце (у непрацоўнага пенсіянера) — 670 рублёў. Гэта плюс 23 працэнты ў адносінах да снежня 2021 года.

У цэлым на выплату пенсій на 2023 год запланавана 18,8 мільярда рублёў, а гэта на 2,5 мільярда больш, чым у 2022 годзе.

— Колькі складаюць штогадовыя выдаткі на падтрымку сем'яў з дзецьмі? На што ў асноўным ідуць гэтыя сродкі?

— Дзяржаўная падтрымка сем'яў забяспечваецца па ўсіх асноўных напрамках. Яна ўключае эканамічныя, сацыяльныя, працоўныя гарантыі і правы. Штогод дзяржаўныя выдаткі на падтрымку сем'яў з дзецьмі складаюць каля 7 працэнтаў валавога ўнутранага прадукту.

Калі на выплату дапамог сем'ям з дзецьмі ў 2022 годзе было прадугледжана 2,7 мільярда рублёў, то на 2023 год на гэтыя мэты запланавана 3,2 мільярда, з іх 2 мільярды — на выплату дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў.

На сямейны капітал, ці нашу супермеру, у 2022 годзе было прадугледжана каля 380 мільёнаў рублёў. Памер сямейнага капіталу штогод індэксуецца нарастаючым вынікам з улікам індэкса спажывецкіх цэн. У 2022 годзе ён складаў амаль 26 тысяч рублёў. У 2023 годзе памер сямейнага капіталу павялічыцца, але паколькі ён індэксуецца па вынікаў года, то канкрэтная сума будзе вызначана ў сярэдзіне студзеня.

Трэба адзначыць, што за перыяд знаходжання грашовых сродкаў у банку на іх налічваюцца працэнты, якія становяцца часткай сямейнага капіталу. У 2023 годзе на праграму сямейнага капіталу з рэспубліканскага бюджэту плануецца выдаткаваць каля 430 мільёнаў рублёў.

Яшчэ адным відам сацыяльнай падтрымкі сем'яў з дзецьмі з'яўляецца дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога (ДАСД). Сёння ў сістэме ДАСД аказваюцца чатыры сацыяльныя дапамогі.

Для сем'яў, якія па аб'ектыўных прычынах маюць нізкі даход, гэта штомесячная сацыяльная дапамога і забеспячэнне прадуктамі харчавання дзяцей да двух гадоў. Прычым для сем'яў з двайнятамі (трайнятамі і больш дзецьмі) забеспячэнне прадуктамі харчавання ажыццяўляецца незалежна ад іх даходу.

Сем'ям, якія часова адчуваюць жыццёвыя цяжкасці, аказваецца аднаразовая сацыяльная дапамога. Таксама сем'ям з дзецьмі-інвалідамі з 4-й ступенню страты здароўя аказваецца матэрыяльная падтрымка на набыццё неабходных прадметаў гігіены.

За дзевяць месяцаў 2022 года атрымальнікамі ўсіх відаў ДАСД сталі 88,3 тысячы чалавек, агульная сума выплат склала каля 48 мільёнаў рублёў.

Важна адзначыць, што падтрымка сем'ям з дзецьмі аказваецца не толькі ў выглядзе прамых матэрыяльных выплат. Дзяржава дае шэраг ільгот і гарантый у сферы аховы здароўя, адукацыі, у жыллёвай сферы, а таксама на дзіцячае аздараўленне і санаторна-курортнае лячэнне.

Як зменіцца сістэма сацыяльнага абслугоўвання?

— Якія асноўныя навацыі прадугледжвае законапраект аб сацыяльным абслугоўванні? Што зменіцца для інвалідаў і пенсіянераў, якія маюць патрэбу ў доглядзе? Як у сувязі з гэтым зменіцца праца тэрытарыяльных установ сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва?

— Усе навацыі новага законапраекта арыентаваны на тое, каб зрабіць сацыяльнае абслугоўванне адрасным, арыентаваным на індывідуальныя патрэбы грамадзян, павысіць яго якасць і эфектыўнасць. Пры гэтым важна захаваць хатняе асяроддзе і сямейную атмасферу для тых, хто ўжо не можа самастойна паклапаціцца пра сябе.

Наша задача — каб аб'ём падтрымкі пажылым і інвалідам адпавядаў іх фактычным патрэбам. Сёння мы выкарыстоўваем медыцынскую мадэль, гэта значыць, вызначаем патрэбу чалавека ў сацыяльных паслугах, грунтуючыся пераважна на стане здароўя.

У законапраекце адлюстраваны новы механізм ацэнкі індывідуальных запатрабаванняў — праз набор «сацыяльных паказанняў». Асноўныя прынцыпы — комплексная ацэнка, індывідуальны падыход, аб'ектыўнасць і празрыстасць.

Акрамя тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дамоў-інтэрнатаў, цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей, у лік устаноў сацыяльнага абслугоўвання плануецца ўключыць цэнтры (дамы) часовага знаходжання асоб без пэўнага месца жыхарства. Гэта дазволіць вызначаць адзіную палітыку іх дзейнасці. Акрамя гэтага, у сістэму ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання будуць уключаны дамы суправаджальнага пражывання.

Законапраектам упершыню ўводзіцца паняцце доўгачасовага догляду па паказанні сацыяльных, медыцынскіх, рэабілітацыйных (абілітацыйных) і іншых паслуг грамадзянам, якія маюць выяўленыя і рэзка выяўленыя абмежаванні жыццядзейнасці.

Пандэмія COVID-19 абумовіла з'яўленне новай формы працы — дыстанцыйнага сацыяльнага абслугоўвання. Гэта дасць магчымасць заканадаўча замацаваць аказанне асобных сацыяльных паслуг з дапамогай відэаканферэнцый і іншых некантактных форм узаемадзеяння.

Асобна закранута пытанне фарміравання пазітыўнага іміджу дамоў-інтэрнатаў у грамадскім успрыманні. Законапраектам прадугледжана змяненне іх найменняў на сацыяльныя пансіянаты.

Новае аблічча дамоў-інтэрнатаў

— Дарэчы, вы часта асабіста наведваеце розныя сацы-

ДЭВІЗ СІСТЭМЫ АБАРОНЫ

яльныя ўстановы, у тым ліку і дамы-інтэрнаты. Што яшчэ, на ваш погляд, трэба памяняць у іх рабоце?

— Варта адзначыць, што за апошнее дзесяцігоддзе істотна змянілася аблічча дамоў-інтэрнатаў. Іх функцыі істотна пашырыліся, укараняюцца новыя кірункі і тэхналогіі працы. Сёння дом-інтэрнат — гэта фактычна шматфункцыянальны комплекс: рэабілітацыя, вольны час, адукацыя, суправаджальнае пражыванне інвалідаў, сацыяльная перадышка для сем'яў, якія самастойна даглядаюць дзіця з інваліднасцю, паслугі дзённага знаходжання.

Задачамі сучасных дамоў-інтэрнатаў з'яўляецца не толькі забеспячэнне тых, хто пражывае, доглядам, харчаваннем, медыцынскай дапамогай, але і правядзенне сацыяльнай рэабілітацыі, падрыхтоўка інвалідаў да самастойнага жыцця за межамі стацыянарных устаноў.

— Змяненні ў Канстытуцыю прадугледжваюць забеспячэнне роўных правоў інвалідаў, сацыяльнай інтэграцыі і стварэння даступнага асяроддзя. Што ўжо зроблена для ажыццяўлення гэтых мер і захавання норм Канвенцыі па правах інвалідаў? Наколькі гэту дзейнасць ускладняе рашэнне Міжнароднага паралімпійскага камітэта па спыненні членства Беларусі ў арганізацыі?

— Як вядома, 30 чэрвеня мінулага года кіраўнік дзяржавы падпісаў Закон «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі». Ён з'яўляецца магутным стымулам для рэалізацыі канкрэтных мер у рэгіёнах па найбольш актуальных пытаннях у адносінах да людзей з інваліднасцю. У развіццё закона ўрад унёс змяненні ў 20 пастаноў, акрамя таго, прынята чатыры новыя дакументы.

Што прынцыпова новага? Па-першае, мы паслядоўна ідзём па шляху інфарматызацыі. Будзе створана інфармацыйная сістэма сацыяльнай падтрымкі і рэабілітацыі інвалідаў. З 2025 года плануецца запусціць аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму ўліку даступнасці аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры «Даступнае асяроддзе».

Па-другое, мы сістэмна тлумачым падыходы па стварэнні даступнага асяроддзя. Зацверджаны Правілы даступнасці аб'ектаў сацыяльнай, транспартнай і вытворчай інфраструктуры, транспартных сродкаў і паслуг. Па сутнасці, гэта дарожная карта, у першую чаргу, для мясцовых органаў улады, якая вызначае, якім патрабаванням і крытэрыям павінны адказваць даступныя для ўсіх катэгорый інвалідаў аб'екты.

Па-трэцяе, мы развіваем магчымасці для сацыяльнай рэабілітацыі і абілітацыі інвалідаў. У частцы тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі пашыраецца пералік катэгорый інвалідаў, якія маюць права на забеспячэнне сродкамі рэабілітацыі бясплатна або на льготных умовах.

Прадугледжваецца выплата грашовай кампенсацыі затрат на асобныя сродкі рэабілітацыі, іх усяго 10. Гэта значыць, пры жаданні іх можна набываць самастойна, на свой выбар, пры гэтым дзяржава будзе кампенсаваць затраты.

Пытанні інваліднасці шматаспектныя. Адносна ўсіх катэгорый — дзеці, інваліды працаздольнага ўзросту і пажылыя — у нашай краіне заканадаўча выбудавана сістэмная палітыка па асноўных напрамках.

У развіццё медыцынскай рэабілітацыі новы закон уводзіць у сістэме сацыяльнага абслугоўвання новы тып устаноў — гэта цэнтры сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў. Прадугледжана таксама магчымасць стварэння аддзяленняў рэабілітацыі, абілітацыі на базе дамоў-інтэрнатаў. Такі падыход дае магчымасць улічваць мэтавыя запыты людзей з інваліднасцю на рэабілітацыю ў канкрэтным рэгіёне.

Закон уводзіць і новую паслугу персанальнага асістэнта. Яна будзе ўлічваць індывідуальныя запыты чалавека з інваліднасцю, прычым комплексна. Напрыклад, чалавека будуць суправаджаць у паліклініку, службу занятасці, дапамогуць у складанні рэзюмэ, запаўненні дакументаў.

Сёння амаль палова інвалідаў у краіне, а гэта каля 200 тысяч чалавек, — людзі працаздольнага ўзросту, з іх каля 120 тысяч маюць паказанні да працы. Працуюць амаль 60 працэнтаў, а гэта больш за 66 тысяч чалавек. Мы разумеем, што на рынку працы людзям з інваліднасцю складана канкурыраваць. Таму законам аб правах інвалідаў прадугледжаны шэраг навацый, накіраваных на ўдасканаленне механізму працаўладкавання і занятасці людзей з інваліднасцю. Гэта кваліраванне працоўных месцаў для людзей з інваліднасцю і павелічэнне тэрміну адаптацыі да працоўнай дзейнасці для інвалідаў з інтэлектуальнымі парушэннямі да двух гадоў.

Што датычыцца рашэння Міжнароднага паралімпійскага камітэта, то на працягу месяца ў Беларусі праходзіла акцыя «Не падвойным стандартам Канвенцыі аб правах інвалідаў», запушчаная Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны ў падтрымку беларускіх паралімпійцаў.

Усе ахвотныя маглі запісаць відэазвароты і адправіць спасылку на іх у Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. За час акцыі паступіла каля паўсотні сюжэтаў. Яны накіраваны ў Камітэт ААН па правах інвалідаў, а таксама на адрас міжнародных спецыяльных працэдур па правах чалавека, якія павінны садзейнічаць інклюзіі, дабівацца выканання правоў чалавека людзей з інваліднасцю.

Сваю нязгоду з рашэннем Міжнароднага паралімпійскага камітэта выказвалі не толькі людзі з інваліднасцю, але і звычайныя грамадзяне: ад педагогаў да рэдакцый газет. Гэта паказвае, як моцна нашы людзі гуртуюцца ў цяжкія моманты, дэманструе іх гатоўнасць дапамагчы і абараніць праўду.

Алена КРАВЕЦ.

Блізкая ўлада

На прыём да сенатара

11 студзеня члены Савета Рэспублікі правядуць адзіны дзень прыёму грамадзян у Мінску, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента. У гэты дзень парламентарыі наведаюць усе раёны сталіцы, сустрэнуцца з жыхарамі, выслухаюць просьбы, прапановы і скаргі і па магчымасці акажуць садзейнічанне ў вырашэнні хвалюючых пытанняў.

Людзей чакаюць у адміністрацыях раёнаў горада Мінска:

Старшыня Савета Рэспублікі КАЧАНАВА Наталля Іванаўна — з 10.00 у адміністрацыі Першамайскага раёна (г. Мінск, зав. К.Чорнага, д. 5; тэлефоны для запісу: 8-017-328-53-24, 8-017-328-58-11);

старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах РУНЕЦ Таццяна Аркадзьеўна — з 10.00 у адміністрацыі Партызанскага раёна (г. Мінск, вул. Захарава, д. 53; тэлефоны для запісу: 8-017-327-27-09, 8- 017-361-63-61, 8-017-395-24-81);

старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч — з 10.00 у адміністрацыі Ленінскага раёна (г. Мінск, вул. Маякоўскага, д. 83; тэлефоны для запісу: 8-017-379-53-21, 8-017-379-82-07, 8-017-222-71-40);

старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні РУСЫ Міхаіл Іванавіч — з 10.00 у адміністрацыі Маскоўскага раёна (г. Мінск, пр-т Дзяржынскага, д. 10; тэлефоны для запісу: 8-017-327-36- 73, 8-017-390-62-68);

старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы РАЧКОЎ Сяргей Анатольевіч — з 10.00 у адміністрацыі Савецкага раёна (г. Мінск, вул. Дарашэвіча, д. 8; тэлефоны для запісу: 8-017-292-03-43, 8- 017-327-27-18);

намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні ІЛЬІНА Марына Аляксандраўна — з 10.00 у адміністрацыі Фрунзенскага раёна (г. Мінск, вул. Кальварыйская, д. 39; тэлефоны для запісу: 8-017-374- -26, 8-017-352-65-54, 8-017-323-41-58);

намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы РУСАКОВІЧ Андрэй Уладзіміравіч — з 10.00 у адміністрацыі Кастрычніцкага раёна (г. Мінск, вул. Чкалава, д. 6; тэлефоны для запісу: 8-017-374-48-10, 8 -025-540-04-27);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы РУМО Алег Алегавіч — з 10.00 у адміністрацыі Цэнтральнага раёна (г. Мінск, вул. Мельнікайтэ, д. 6; тэлефоны для запісу: 8-017-338-42-97, 8- 017-302-75-10, 8-029-123-83-07);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні ЯКУБІЦКАЯ Наталля Віктараўна — з 10.00 у адміністрацыі Заводскага раёна (г. Мінск, вул. Жылуновіча, д. 17; тэлефоны для запісу: 8-017-389-26-26, 8- 029-849-33-88);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці ДРАЗДОЎСКІ Канстанцін Вікенцьевіч правядзе прыём з 10.00 у дзяржаўнай установе «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай хірургіі» (г. Мінск, пр-т Незалежнасці, д. 64а; тэлефон для запісу 8 -029-688-10-17).

Папярэдні запіс на прыёмы здзяйсняецца 5 і 6 студзеня з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 16.00.

Па сутнасці

Палітыка гасціннасці

У гэтыя светлыя дні года, калі нават дарослыя спрабуюць паверыць у казку, калі зноў нараджаецца ВЕРА, ЛЮБОЎ, НАДЗЕЯ, а яшчэ дабрыня і спагада, калі сонейка імкнецца наверх, а дзень па хвілінцы прырастае, калі нават у не па-зімоваму цёплым паветры адчуваецца атмасфера Раства Хрыстова, беларусы паводзяць сябе па-хрысціянску. Памятаеце гэту біблейскую гісторыю, як немаўляці, што выратуе цэлы свет, не знайшлося нават маленькага куточка, дзе можна было прытуліцца. У Беларусі для вандроўнікаў месца заўсёды знойдзецца. «Ласкава запрашаем». Гэта не толькі словы з турыстычнага банара. Гэта мэйнстрым знешнепалітычнага ведамства краіны.

Прэзідэнт падтрымаў бязвіз. Для жыхароў Польшчы, Літвы і Латвіі гасцінны рэжым дзейнічае ўвесь новы 2023 год. І гэта, здавалася б, толькі юрыдычная акалічнасць насамрэч люстэрка, якое шмат што паказвае. І толькі добрае для нашай краіны.

Колькі б на нашу краіну і ўладу ні «сыпалі» фальшы, бруду, фэйкаў, колькі б ні кпілі, колькі б ні спрабавалі разбіць аўтарытэт спецаперацыямі кшталту інцыдэнту з Ryanair, марна! Мы па-чалавечы. Асабліва да тых, чые прадстаўнікі ўлады больш за ўсё стараліся прынізіць Беларусь, зняць яе сцяг... Аб чым гэта сведчыць? Аб тым, што чуткі пра злобны і помслівы характар Лукашэнкі — чарговая хлусня. Яны ад нас спіраллю Бруно і бетоннай агароджай, а мы — жалезабетонным аргументам — бязвізам. Яны сцены непаразумення, а мы — масты сяброўства, бо разумеем, што палітыка ў суседніх краінах — адно, а стаўленне да Беларусі асноўнай часткі насельніцтва гэтых краін — зусім іншае.

Колькі б ні ўкладалі сродкаў заходнія інвестары ў стварэнне ў сумежных краінах «страшылак» аб Беларусі — марна. Так званае сарафаннае радыё перамагае ўсе намаганні цэнтраў псіхалагічнага ўздзеяння. А гэтыя беспадстаўныя і абсурдныя абвінавачанні, перасцярогі і запалохванні працуюць наадварот. Людзі едуць да нас, каб пераканацца ў іншым.

Жыхары Вільнюса, Рыгі і Варшавы едуць да нас. Едуць ахвотна. За мінулы год магчымасцю бязвізавага ўезду скарысталіся амаль 370 тысяч жыхароў Латвіі, Літвы і Польшчы. А гэта больш, чым палова насельніцтва Рыгі. Дарэчы, у Латвіі ўвялі турыстычны збор за суткі — еўра. У Беларусі — бязвіз. І дзе эканамічная сітуацыя лепшая? І дзе турыстычнае асяроддзе больш транспарэнтнае?

Дарэчы, падаўжэнне бязвізу — гэта не толькі крок нашага знешнепалітычнага ведамства ў найлепшых традыцыях беларускай дыпламатыі — праяўляць ініцыятывы добрасуседства насуперак і нягледзячы на ўсе тыя абмежаванні, якія існуюць у адносінах да беларускіх грамадзян. Гэта жаданне пацвердзіць адкрытасць краіны, нацэленасць на добрасуседства і ўмацаванне міжнацыянальных сувязяў. Але гэта яшчэ і рэакцыя на зварот грамадзян іншых краін.

З пачаткам дзеяння бязвізу рэгулярна, ледзьве не кожны дзень, на адрас МЗС — словы падзякі і звароты ад дыяспар, турыстаў ды і сваякоў падоўжыць гэту ініцыятыву. У Мінску да просьбаў суседзяў (людзей, а не ўлады) прыслухаліся.

Роднасныя, гістарычныя сувязі межаў не маюць. А палітыка Беларусі садзейнічае іх зберажэнню. А палітыкі ў суседніх краінах, якія гэтаму перашкаджаюць, сыдуць. Ну як палітыкі — кіраўнікі філіялаў англасаксонскіх латыфундый...

Вядома, можна з сарказмам сказаць: прыбалтыйскія турысты прыязджаюць пагрэцца ў беларускія гатэлі і санаторыі ды на «цукровы» шопінг па «салодкіх» цэнах. Але насамрэч людзей прываблівае нават прамысловы турызм. Прыязджаюць паглядзець і зрабіць сэлфі ў лакацыях захаванай і ўзбагачанай савецкай спадчыны. Там такога няма. Еўрапейскія дарадцы знішчылі эканамічны суверэнітэт Прыбалтыкі нават без «хаймарсаў».

Адноўленыя замкі ды палацы, аўтэнтычныя абрады ды народныя промыслы. Усё гэта захавала Беларусь. А яшчэ трэба зразумець, што нельга па нечай дурной волі выкрасліць нашу краіну з карты Усходняй Еўропы. Бо нібыта польскі Міцкевіч альбо літоўскі Вітаўтас (літоўскі — увогуле спрэчная геаграфічная акалічнасць) вельмі цесна звязаны з Беларуссю. А наш народ увабраў у сябе ўсю прыгажосць розных культур.

Усё гэта прываблівае турыстаў, бо нават у самым гушчары Белавежжа ў нас святлей і ўтульней, чым у кватэрах цэнтра Рыгі. Бадай што менавіта ў Беларусі жыве сапраўдная зімовая казка, і ад яе плотам не адгародзішся. Ды і што такое плот для ветлівых слоў з нашай песні, што сталі рэчаіснасцю нашай знешняй палітыкі: «Прыязджайце да нас у Беларусь!»

Яўген ПУСТАВОЙ.

Абітурыент-2023

ДАДАТКОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ ЎСВЯДОМЛЕНАГА ВЫБАРУ ПРАФЕСІІ

Рэпетыцыя ЦЭ з удзелам усіх выпускнікоў школ пройдзе ў краіне 28 студзеня

Кіраўніком краіны зацверджана новая рэдакцыя Правіл прыёму асоб для атрымання вышэйшай адукацыі.

— Усе навелы ў парадку адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет абумоўлены духам часу і тымі працэсамі, што адбываюцца ў эканоміцы і ў сістэме адукацыі. У новых правілах створана шмат дадатковых магчымасцяў для тых, хто насамрэч усвядомлена выбірае і спецыяльнасць, і ВНУ, збіраецца стаць запатрабаваным спецыялістам і прафесійна расці, — лічыць **начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ.** — Гэта і новыя асаблівыя падыходы да мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў, якая, па сутнасці, з'яўляецца найбольш эфектыўнай формай заказу кадраў.

Змяняецца і сама этапнасць правядзення ўступнай кампаніі. Фактычна яна ўжо стартавала з правядзення ўнутрыўніверсітэцкіх алімпіяд у рэгіянальных ВНУ. У сакавіку вызначацца іх пераможцы, якія датэрмінова становяцца студэнтамі, хоць напярэдзе іх яшчэ чакаюць цэнтралізаваныя экзамены на выхадзе са школы. Гэтыя экзамены з'яўляюцца формай выніковай атэстацыі, таму яны застаюцца абавязковымі для ўсіх, акрамя пераможцаў рэспубліканскіх алімпіяд па вучэбных прадметах.

— Цэнтралізаваны экзамен — гэта ў першую чаргу выпускны экзамен, вынікі якога ўлічваюцца пры выстаўленні выніковай адзнакі ў атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі, — тлумачыць **начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына КАРЖОВА.** — Ад цэнтралізаванага экзамену ў 11 класе вызваляюцца толькі пераможцы рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах. Па тым прадмеце, па якім чалавек стаў пераможцам, яму выстаўляецца 10 балаў, па другім прадмеце — гадавая адзнака.

А пераможцы трэцяга (абласнога) этапу рэспубліканскай алімпіяды вызваляюцца ад ЦЭ па тым прадмеце, па якім навучэнец стаў пераможцам. Па гэтым прадмеце яму выстаўляецца 10 балаў.

Ірына Каржова ўпэўнена, што аб'яднанне выпускных і ўступных іспытаў у ВНУ істотна змяншае нагрузку на выпускнікоў, якім яшчэ год таму даводзілася здаваць чатыры экзамены на выхадзе са школы плюс тры або чатыры ЦТ. Прычым, калі ў школе яны пісалі пераказ ці кантрольную работу, цяпер адбылася ўніфікацыя форм экзаменацыйных выпрабаванняў. І ЦЭ, і ЦТ здаюцца ў тэставай форме, што істотна спрашчае падрыхтоўку.

Да таго ж новая мадэль дазваляе забяспечыць больш матываваны выбар будучай прафесіі, бо яшчэ на этапе, які прадмет выбраць на ЦЭ, адзінаццацікласнікі вызначаюцца з далейшай траекторыяй навучання пасля атрымання школьнага атэстата.

Ірына Каржова звярнула ўвагу, што пры выбары вучэбнага прадмета для здачы ЦЭ не мае значэння, з'яўляецца ён першым або другім прадметам прафільнага іспыту пры паступленні ва ўстановы вышэйшай адукацыі. Усё гэта накіравана на стварэнне максімальна камфортных умоў для будучых абітурыентаў.

Дарэчы, і пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд цяпер змогуць паступаць без экзаменаў на спецыяльнасці, дзе прадмет, па якім яны перамаглі, з'яўляецца першым або другім профільным (а раней яны маглі арыентавацца толькі на першы профільны прадмет).

Плануецца, што ў 2023 годзе цэнтралізаваны экзамен будуць здаваць 54 тысячы чалавек: з іх каля 53 тысяч — гэта адзінаццацікласнікі і крыху больш за 1 тысячу здадуць яго ў парадку экстэрнату.

28 студзеня ў краіне пройдзе рэпетыцыйны цэнтралізаваны экзамен, у якім прымуць удзел усе выпускнікі школ Беларусі. Для гэтых мэт будуць задзейнічаны 144 пункты. Такія пункты былі вызначаны абсалютна ва ўсіх раёнах.

— Наша задача — паглядзець гатоўнасць да правядзення ЦЭ і выправіць тыя арганізацыйныя тонкасці і нюансы, якія нельга ўбачыць, працуючы з дакументамі, — патлумачыла Ірына Каржова. — Рэпетыцыйны ЦЭ будзе праходзіць у строгай адпаведнасці з інструкцыяй аб яго правядзенні. На яго ўжо адбылася рэгістрацыя выпускнікоў. 28 студзеня будзе арганізавана дастаўка адзінаццацікласнікаў у пункты ЦЭ. Калі гэта сельская школа, то будзе арганізаваны падвоз, гэта значыць, што органы ўпраўлення адукацыі змогуць змадэляваць арганізацыю падвозу навучэнцаў. Калі размова ідзе аб вялікіх населеных пунктах, такіх як Мінск, або пра абласныя цэнтры, там трэба будзе прадугледзець павелічэнне грамадскага транспарту ў гэты час, каб будучыя абітурыенты змаглі пад'ехаць да пунктаў ЦЭ. На самім жа пунктах будзе арганізаваны прапускны рэжым і рассадка па аўдыторыях.

Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў рыхтуе валізы, якія будуць дастаўляцца ў пункты правядзення цэнтралізаванага экзамену. Усё гэта мы плануем адпрацаваць 28 студзеня.

У тэстах не будуць выкарыстоўвацца заданні павышанага пятага ўзроўню складанасці. Тэсты сфарміраваныя на аснове заданняў базавага ўзроўню асваення праграм па вучэбных прадметах. Як паказала практыка, заданні чатырох узроўняў складанасці паспяхова спраўляюцца з задачай ранжыравання прэтэндэнтаў на студэнцкі білет.

Наступны этап прыёмнай кампаніі — рэгістрацыя на ЦТ, якая будзе праходзіць з 10 мая да 1 чэрвеня.

Асноўныя даты правядзення цэнтралізаваных экзаменаў — 14 мая (па рускай або беларускай мове) і 21 мая (прадмет на выбар). Адзінаццацікласнікі павінны вызначыцца з навучальным прадметам, які яны будуць здаваць на ЦЭ, да 1 сакавіка. Такім чынам, канчатковы выбар неабходна зрабіць у лютым.

Галоўная адметнасць ЦЭ — яго вынікі афармляюцца сертыфікатам, як і вынікі цэнтралізаванага тэсціравання. Ацэньваюцца яны па стабальнай шкале, затым пераводзяцца ў 10-бальную, і сярэдняе арыфметычнае гадавой адзнакі і вынікаў ЦЭ выстаўляецца ў атэстат, а сам сертыфікат залічваецца пры паступленні ва ўстанову вышэйшай адукацыі. Сертыфікаты ЦЭ, як і сертыфікаты ЦТ, будуць дзейнічаць два гады.

Напрыканцы мая — у пачатку чэрвеня ў ВНУ пройдзе адбор на навучанне на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. Абітурыенты, акрамя пакета дакументаў, павінны будуць прадставіць у прыёмную камісію ВНУ дагавор, заключаны з патэнцыяльным заказчыкам кадраў. Конкурсны адбор будзе адбывацца на аснове сумы балаў, атрыманых падчас вуснага іспыту ў ВНУ і сярэдняга бала дакумента аб адукацыі. Прозвішчы залічаных стануць вядомыя 12—13 чэрвеня.

Далей абітурыентаў чакае цэнтралізаванае тэсціраванне. Выпускнікі школ 2023 года маюць права здаць на ЦТ у гэтым годзе толькі адзін прадмет.

Прыёмныя камісіі ВНУ арыенціровачна распачнуць прыём дакументаў у абітурыентаў 18—20 ліпеня і канчаткова завершаць яго на ўсе формы атрымання вышэйшай адукацыі 10 жніўня.

Цэнтралізаваныя экзамены можна здаваць у асноўныя тэрміны і ў рэзервовыя дні. Рэзервовыя экзамены будуць арганізаваны некалькі разоў — у маі, ліпені (гэтыя даты супадуць з рэзервовымі днямі ЦТ), а таксама ў жніўні. Тыя, хто здасць цэнтралізаваныя экзамены ў асноўныя тэрміны, у рэзервовыя дні ў маі або ў ліпені, захоўваюць магчымасць паступлення ў ВНУ, яны паспяваюць падаць дакументы ў прыёмную камісію для ўдзелу ў конкурсе. Тыя ж, хто будзе здаваць ЦЭ ў жніўні, змогуць працягнуць навучанне ва ўстановах прафесійнай адукацыі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

САПРАЎДНЫ НАВАГОДНІ ЦУД

Па традыцыі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка перадае падарункі першым беларусам новага года і іх мамам. Сёлета гэта традыцыя прадоўжылася.

Юлію Мацюшэўскую і маленькую Валерыю ў РНПЦ «Маці і дзіця» павіншавала прэс-сакратар Прэзідэнта Наталля Эйсмант. Юлія расказала, што роды прыпалі акурат на наступленне новага года. Яна папрасіла анестэзіёлага ўключыць трансляцыю выступлення Прэзідэнта. «Я слухала выступленне. І вось бой курантаў, гімн, першая секунда — і крык дзіцяці. Гэта было так здорава», — падзялілася ўражаннямі жанчына. Маленькая Валерыя сапраўды нарадзілася адной з першых. Свой першы ўздых яна зрабіла пад акампанемент гімна.

Наталля Эйсмант адзначыла, што ў такіх сем'ях павінна быць шмат дзяцей. «На такіх сем'ях наша краіна і трымаецца», — заўважыла прэс-сакратар Прэзідэнта. Яна пажадала маме і малой здароўя. Дома маленькую Валерыю і маму чакае васьмігадовы Глеб.

У першыя хвіліны новага года дзяўчынка нарадзілася і ў мінчанкі Маргарыты Астроўскай. Падарункі ад кіраўніка дзяржавы ёй перадаў старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў. «Усе звязваюць навагоднюю ноч з цудамі і здзяйсненнем жаданняў. Такога Новага года ў мяне яшчэ не было ў жыцці. Здарыўся сапраўды навагодні цуд. Эмоцыі зашкальваюць дагэтуль: гэта незвычайна — нараджаць у навагоднюю ноч, тым больш у першую хвіліну новага года, пад гукі феерверкаў», — падзялілася Маргарыта Астроўская.

Міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч перадаў падарункі і віншаванні ад імя кіраўніка дзяржавы адзінаму хлопчыку, які нарадзіўся ў сталіцы разам з новым годам. «Кожны Новы год — гэта свята. І двайное свята ў тых сем'ях, дзе дзеткі з'яўляюцца 1 студзеня. Я лічу, што добра нарадзіцца ў свята», — адзначыў Дзмітрый Піневіч. Міністр заўважыў, што маленькі Сямён, які нарадзіўся ў 3-й бальніцы, упісаў сваю старонку ў гісторыю ўстановы аховы здароўя, якой сёлета спаўняецца 195 гадоў.

Фота Белта

Дзмітрый ПІНЕВІЧ віншуе новага жыхара сталіцы і яго маму.

Таццяна Чыгрын, маці Сямёна, распавяла, што нараджэнне дзіцяці ў навагоднюю ноч стала для яе нечаканасцю: «Вядома, не чакала. Планавалі крыху пазней: тэрмін ставілі на 7 студзеня. Але адправілі ў бальніцу раней. Тое, што пачнецца ў навагоднюю ноч, было вельмі нечакана. Дзіця само па сабе падарунак. Не чакала, што ўся краіна будзе віншаваць», — падзялілася ўражаннямі жанчына.

Навагодні цуд здарыўся і ў Бабруйскім радзільным доме. Марта Міхнюк расказала, што такі падарунак стаў для іх з мужам нечаканасцю. 31 снежня яны спакойна рыхтаваліся да свята, нават не падазраючы, што хутка на свет папросіцца іх дачушка. Першапачаткова роды прызначалі на 5 студзеня. Але каля 20.00 31 снежня жанчына ўжо была ў радзільным доме. «Для нас з мужам гэта было доўгачаканае дзіця. Таму з'яўленне нашай дзяўчынкі стала самым лепшым падарункам на Новы год», — расказала Марта.

Павіншаваць маладую маці па даручэнні Прэзідэнта прыехаў намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Малашка. Разам з ім — начальнік галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Магілёўскага аблвыканкама Аляксандр Старавойтаў, які ў тым ліку перадаў падарункі ад Міністэрства аховы здароўя.

Усяго за першыя суткі 2023 года ў краіне нарадзіліся 110 дзяцей.

Валерыя СЦЯЦКО.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Польшча атрымала ад Германіі афіцыйную адмову ў перагаворах аб рэпарацыях

Урад Германіі дыпламатычнай нотай апавясціў польскі бок аб адмове весці перагаворы аб рэпарацыях за шкоду, атрыманую Польшчай у гады Другой сусветнай вайны. Аб гэтым паведамляюць PIA «Навіны» са спасылкай на заяву МЗС Польшчы.

Адзначаецца, што польскае знешнепалітычнае ведамства атрымала ноту 3 студзеня.

У МЗС Польшчы паведамілі, што нямецкі ўрад лічыць пытанне аб рэпарацыях і кампенсацыі за ваенныя страты Польшчы закрытым і не плануе праводзіць якія-небудзь перагаворы па гэтай тэме.

Намеснік міністра замежных спраў Польшчы, упаўнаважаны ўрада па пытаннях кампенсацый Аркадзіуш Мулярчык падкрэсліў, што такое рашэнне Германіі гаворыць аб непавазлівым стаўленні Берліна да Польшчы і палякаў. Ён таксама звярнуў увагу на тое, што ў адказе Берліна на ноту Польшчы «няма юрыдычнай аргументацыі».

Пераход Кітая да набыцця нафты за нацвалюту вядзе да новага сусветнага энергапарадку

Гатоўнасць КНР перайсці да аплаты ў юанях нафты, якая пастаўляецца з краін Персідскага заліва, вядзе да стварэння новага сусветнага энергетычнага парадку, піша Financial Times, спасылаючыся на меркаванне экспертаў.

Банкаўскі аналітык Золтан Пажар адзначае, што Кітай хоча змяніць правілы сусветнага энергарынку. Паводле яго слоў, КНР у апошні час павялічвае пакупку за юані чорнага золата з Ірана, Венесуэлы, РФ, шэрагу афрыканскіх краін. Пры гэтым, як лічыць эксперт, менавіта сустрэча кітайскага лідара Сі Цзіньпіна з кіраўнікамі краін Савета супрацоўніцтва арабскіх дзяржаў Персідскага заліва (ССАДПЗ) у снежні 2022 года азнаменавала «нараджэнне нафтаюаня». Падчас візіту ў сталіцу Саудаўскай Аравіі Эр-Рыяд Сі Цзіньпін заявіў, што Кітай будзе прасоўваць з краінамі ССАДПЗ разлікі па гандлі нафтай і газам у сваёй нацыянальнай валюце.

Эксперт лічыць, што Кітай прымяняе стратэгію па скарачэнні гандлю ў доларах ЗША, якую таксама падтрымліваюць яго партнёры па БРІКС і шэраг іншых краін на фоне ператварэння доларавых валютных рэзерваў у палітычную зброю Злучаных Штатаў Амерыкі.

Золтан Пажар паказвае, што замацаванне юаня ў якасці асноўнага сусветнага плацежнага сродку за энергасыравіну выглядае яшчэ больш магчымым, улічваючы той факт, што дзяржавы з найбольшымі пацверджанымі запасамі чорнага золата (Расія, Іран, Венесуэла, Інданезія і дзяржавы на поўначы і захадзе Афрыкі) па сваіх поглядах бліжэйшыя менавіта да Кітая, а не да Злучаных Штатаў.

Брытанія і Грэцыя хутка завершаць 200-гадовую спрэчку з-за скульптур Парфенона

Брытанскі музей і Музей Акропаля ў Афінах хутка дасягнуць пагаднення, паводле якога мармуровыя скульптуры Парфенона вернуцца з Вялікабрытаніі ў Грэцыю, паведамляе Bloomberg.

Гэта завершыць канфлікт паміж музеямі, які працягваецца з XIX стагоддзя. Элементы храма на акропалі, якія ў 1802 годзе вывез брытанскі пасол у Асманскай імперыі лорд Томас Брус Элгін, будуць паступова вернуты ў Грэцыю на працягу некалькіх гадоў.

Свае машыны хуткай дапамогі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

І вось прыйшоў час замацаваць напрацоўкі афіцыйным пагадненнем, што і адбылося ў канцы снежня ў Брэсце. Дакумент падпісалі генеральны дырэктар ТАА «Швабе Спецаўто» Мікалай Сандугей і дырэктар ААТ «Брэстмаш» Аляксей Бражук. Мяркуецца, што на першым этапе на заводзе будуць збіраць каля 500 адзінак 26 мадэляў тэхнікі.

— Праект створаны пад пляцоўкі, якія ёсць у нас, — адзначыў Аляксей Бражук. — У ходзе напаўнення праекта зместам і выхадам яго на запланаваныя магутнасці будуць створаны дадатковыя рабочыя месцы. Трэба задаць тэмп, які забяспечыць далейшае развіццё.

На прэзентацыі адзначалася, што падзеі і выклікі апошняга часу прымушаюць гаспадарнікаў рухацца хутчэй, максімальна эфектыўна выкарыстоўваць напрацоўкі, кампетэнцыі, вытворчыя плошчы, якія маюцца. Сведчаннем таму і брэсцкі праект. Ён ад пачатку распрацаваны пад пляцоўкі «Брэстмаша». Вытворчыя магутнасці завода дазваляюць збіраць да дзвюх тысяч аўтамабіляў у год.

Названы завод налета адзначыць сваё 50-годдзе. У 70-х гадах мінулага стагоддзя для забеспячэння прадпрыемстваў лёгкай і харчовай прамысловасці тэхналагічным абсталяваннем было прынята рашэнне аб будаўніцтве ў Брэсце заводаў «Тэкстыльмаш» і «Мясамалмаш». Заводы былі ўзведзены

Фота Аляксандра ШУЛЬГІНА.

адпаведна з планам і працавалі да сярэдзіны 80-х гадоў, менавіта тады іх аб'ядналі. Эстафету вытворчасці тэхналагічнага абсталявання для тэкстыльнай, малочнай і мясной прамысловасці прадоўжыў Брэсцкі машынабудаўнічы завод, які ў 2005 годзе стаў адкрытым акцыянерным таварыствам. Апошнія дзесяцігоддзі «Брэстмаш» — прызнаны лідар вытворчасці тэхналагічнага абсталявання. Прадпрыемствы малочнай, кандытарскай, хлебапякарнай і касметычнай прамысловасці многіх краін высока ацэньваюць помпавае абсталяванне брэсцкай вытворчасці. Прадпрыемства з'яўляецца шматгадовым партнёрам заводаў па вытворчасці газавых і электрычных бытавых пліт у Расійскай Федэрацыі і Беларусі.

Уваходжанне ў 2013 годзе ААТ «Брэстмаш» у холдынг «БелаўтаМАЗ» адкрыла магчымасці для далейшага развіцця прадпрыемства. Новымі кірункамі дзейнасці сталі выпуск камплектуючых для вытворчасці аўтамабільнага транспарту, зборка грузавых і пасажырскіх машын.

Зараз на прадпрыемстве працуе каля 280 чалавек, у далейшым, як ужо было сказана, плануецца пашырэнне вытворчасці і рост колькасці рабочых месцаў.

Чакаецца, што ў студзені з канвеера сыдзе першая партыя новай лінейкі аўтамабіляў. На прадпрыемстве адзначылі, што ўсе машыны, якія збіраюцца, ужо фактычна прададзены. Камерцыйныя продажы вядуцца праз дылерскія цэнтры ВАЗ на тэрыторыі Беларусі, а бюджэтныя — па дзяржзаказе, напрамую праз прадпрыемства.

Раней у нашу краіну, напрыклад, машыны хуткай дапамогі паступалі на базе Nissan, Renault, Peugeot. Аднак пасля ўвядзення санкцый гэта стала немагчыма. Як высветлілася, некаторыя камплектуючыя для гэтых машын падпадаюць пад тавары двайнога прызначэння. Такім чынам, менавіта санкцыі сталі штуршком для развіцця сумеснай вытворчасці ў галіне машынабудавання. І зараз на «Брэстмашы» поўным ходам ідзе зборка сваіх аўтамабіляў. Да названых раней можна дадаць прамтаварны фургон, і пералік мадэляў будзе расці.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Медыцынскі эксперымент

Да птушак па здароўе

Унікальны аздараўленчы праект фазанатэрапіі

З уласным астраўком чароўнай казкі гэты Новы год сустракае Гомельская ўніверсітэцкая клініка — абласны шпіталь інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Буйства фарбаў і панаванне толькі станоўчых эмоцый — так гомельскія медыкі і іх пацыенты характарызуюць адзіны ў краіне праект пэт-тэрапіі, ці заатэрапіі, — лячэння хворых жывёламі і птушкамі. У гомельскім шпіталі папулярнасць набывае незвычайная лячэбная зона — пацыентаў у ёй «прымаюць» залацістыя фазаны.

Фота аўтара.

Вядома, што зносіны з птушкай, як і з сабакам, катом, канём і іншымі гадаванцамі, зніжаюць трывожнасць, умацоўваюць нервовую сістэму і павышаюць імунітэт. Прыхільнікі пэт-тэрапіі перакананы, што жывыя істоты дапамагаюць людзям стабілізаваць эмоцыі, развіваць давер да навакольных і ўпэўненасць у сабе, паляпшаць навыкі зносін і сацыялізацыі. Аб унікальным аздараўленчым праекце фазанатэрапіі для пацыентаў з цяжкімі захворваннямі можа шмат цікавага расказаць **галоўны ўрач Гомельскай універсітэцкай клінікі — абласнога шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны Алег ІВАНЦОЎ.**

— Калі пацыенты пакутуюць на нейкія паталогіі, у іх даволі сур'ёзна парушаецца эмацыянальны фон, з'яўляецца дэпрэсія, яны ўвесь час думаюць пра сваю хваробу. Гэты фон вельмі цяжка часам прыбраць медыкаментозна, — адзначае Алег Іванцоў.

Пэт-тэрапія заключаецца ў тым, што пацыенты бачаць жыццярадасных, актыўных, яркіх, прыгожых птушак, якія вельмі цікава сябе паводзяць, не агрэсіўныя ў адносінах да чалавека.

— Атрымліваецца, калі пацыент бачыць гэтае ўвасабленне прыгажосці, жыцця, то ў яго натуральна падымаецца настрой, эмацыянальны фон, узмацняецца выпрацоўка гармонаў радасці. Хворы чалавек пачынае адчуваць сябе лепш фізічна пасля зносін з жывым светам. Нават дзеянне лекаў паляпшаецца, павышаецца актыўнасць і значна хутчэй ідзе працэс выздараўлення. Таму мы і прапануем нашым пацыентам: назіраць за фазанамі, пакуль маразы, холадна, хоць бы раз у дзень. Цікава, што вяртаюцца ў лячэбны корпус пасля наведвання фазанаў людзі з усмешкай, з добрым настроем, а гэта ў любым выпадку з'яўляецца дапамогай у лячэнні, — падкрэслівае галоўны ўрач гомельскага шпіталя.

Дарэчы, праект зоатэрапіі асабліва значэнне атрымаў менавіта для гэтай гомельскай медыцынскай установы, бо абласны шпіталь інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны аказвае экстранную неўралагічную дапамогу жыхарам горада Гомеля і Гомельскага раёна, медыцынскую рэабілітацыю пацыентаў з неўралагічнай і анкалагічнай паталогіямі. Упершыню ў краіне ў гомельскім абласным шпіталі арганізаваны замкнёны цыкл лячэння пацыентаў з інсультам — ад паступлення ў прыёмнае аддзяленне да поўнай рэабілітацыі і аднаўлення здароўя. Менавіта на базе шпіталя па даручэнні Прэзідэнта таксама арганізавана ўніверсітэцкая клініка, дзе размяшчаюцца чатыры кафедры навучання гомельскіх студэнтаў-медыкаў.

— Значныя клінічныя кафедры ўнутраных хвароб, тэрапіі, хірургіі і неўралогіі-нейрахірургіі, дзе якраз арганізаваны курс медыцынскай рэабілітацыі. І ўсе студэнты, якія прыходзяць на навучанне да нас, могуць таксама азнаёміцца, як праводзіць рэабілітацыю пры дапамозе пэт-тэрапіі. Пасля запуску нашага праекта па фазанатэрапіі менавіта студэнты вельмі актыўна адгукнуліся на магчымасць правесці даследаванні па такім відзе работы з пацыентамі, — тлумачыць Алег Іванцоў.

Дарэчы, птушкі зусім не баяцца халадоў. Напрыклад, у Якуціі яны лёгка выжываюць нават пры мінус сарака градусах. А вось пацыентам пакуль з-за халадоў медыкі не могуць рэкамендаваць наведваць фазанаў належны час.

— Але, як толькі стане цяплей, з вясны, мы ўжо запланавалі пэўныя этапы рэабілітацыі. Абавязковы ранішні: калі пацыенты, каб актывізаваць свае жыццёвыя функцыі, будуць выходзіць на вуліцу на зарадку — у нас спецыяльна адведзена для гэтага пляцоўка, і яна якраз на шляху да вальера з фазанамі. Штораніцы пацыенты змогуць пазаймацца фізічна і палюбавацца птушкамі. Гэта этап рэабілітацыі, які будзе садзейнічаць больш хуткаму выздараўленню, — перакананы сурасмоўца.

У шпіталі па меры захворвання пацыентаў да фазанатэрапіі пачнуць весці дзённік назірання за працэсам аздараўлення. Плануюць зрабіць і навуковае абгрунтаванне вынікаў назіранняў за станам хворых да зносін з птушкамі і пасля.

Дарэчы, гадаванцаў у якасці дабрачыннай дапамогі шпіталю перадаў неабыякавы гамяльчанін, былы пацыент медустановы. Вальер для фазанаў таксама ў якасці дабрачыннай дапамогі шпіталю зрабіла гомельскае прадпрыемства. Корм для птушак купляюць і перадаюць неабыякавыя жыхары абласнога цэнтра.

— Людзі гатовы дапамагаць. Пасля таго як у нас з'явіліся фазаны і мы сталі праводзіць такую тэрапію прыгажосцю, як я кажу, са мной звязаліся калегі з усёй краіны. Але больш за ўсё званкоў паступае ад простых грамадзян, якія жадаюць дапамагчы, прапануюць нават падарыць яшчэ больш фазанаў, — падзяліўся Алег Іванцоў.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ПРАЎДЗІВЫ ХАРАКТАР МАСТАЦКАГА СУМЛЕННЯ

85 гадоў Алегу Аляксеевічу ЖДАНУ. Пісьменніку з Вялікай Літары

Цяжка сказаць, ці заўважаць гэтую дату ў розных календарах, наўрад ці ў навінах медыя будзе пазначана яна адпаведным радком. Алег Аляксеевіч ад гэтага нічога не згубіць і нічога не знойдзе. Але ёсць упэўненасць, што яго добра ведае чытач, які шукае сапраўдную літаратуру. Цяжка адным словам, так адразу сказаць, пра што ён усё ж піша.



Фота Канстанцыі ДРОБАВА.

Кнігі апошніх гадоў празаіка, які піша ў асноўным на рускай мове, але выдаецца і па-беларуску, у перакладзе сяброў-паплечнікаў, — і для дарослага, і для юнага, дзіцячага чытача. Ён, Алег Ждан, які надрукаваў сваё першае апавяданне ў «Литературной России» некалькі дзесяцігоддзяў таму, піша пра жыццё. Пра тое жыццё, якое знаёма і чытачам, але ўмела, па-майстэрску расказвае ў звязку з гэтым жыццём пра перакананні чалавека, яго сутнасць, пра маральныя прынцыпы, пра здраду і сумненні, пра вернасць і таварыскасць, пра дружбу і падман...

